***А. І. Бабко,***
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры філасофіі*

# КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНЫЯ ПЕРАДУМОВЫ КЛАСІЧНАЙ ДЫЯЛЕКТЫКІ

Філасофія выступае як культурна-гістарычны феномен: разгортванне філасофскага пошуку, з аднаго боку, істотным чынам абумоўлена культурнымі працэсамі, ва ўмовах якіх яно адбываецца, а з іншага – надае магутны імпульс іх разгортванню. У сувязі з гэтым паўстае шырокі спектр даследчых задач, звязаных з раскрыццём характару і механізмаў адпаведных узаемадзеянняў – як у самым агульным плане, так і на ўзроўні пэўных філасофскіх кірункаў, сістэм і традыцый. Той момант, што класічная дыялектыка належыць да самых уплывовых (ва ўсіх адносінах) феноменаў у гісторыі філасофіі і культуры, падаецца відавочным. Таму высвятленне культурна-гістарычных абставін, якія паспрыялі яе распрацоўцы, мае надзвычай важнае значэнне. Неабходна адзначыць актуальны характар адпаведнай даследчай задачы, што звязана найперш з метадалагічнай натурай дыялектыкі: раскрыццё фактараў, якія садзейнічалі яе ўзнікненню, павінна дапамагчы больш дакладна і ясна акрэсліць умовы яе эфектыўнага ўжывання.

Сваю класічную форму дыялектычная метадалогія атрымала ў выніку творчых пошукаў Гегеля, што разгортваліся ў канцы XVIII – першай трэці XIX стагоддзя. Гаворка ідзе пра эпоху, характар і змест якой вызначаецца вызваленнем грамадства ад рэстрыктыўных сярэднявечных грамадскіх формаў, што мела ў найвышэйшай ступені складаны, супярэчлівы, у шмат якіх адносінах трагічны характар. Магутны штуршок згаданаму працэсу дала Вялікая французская рэвалюцыя – падзея, якая надзвычай моцна паўплывала на Гегеля.

Глыбокая ўзаемасувязь рэвалюцыі і дыялектыкі выразна выяўляецца на самых розных узроўнях, у розных сферах грамадскага жыцця і ў самых розных формах. У першую чаргу неабходна падкрэсліць, што рэвалюцыйная дзея мае сваёй перадумовай глыбокі крызіс грамадства, які выяўляецца ў абвостраных сацыяльных супярэчнасцях, трагічных міжасобасных калізіях, усебаковай ідэалагізацыі духоўнай сферы. Стрыжнё-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вым момантам згаданых супярэчлівых варункаў з’яўляецца несупынная, бескампрамісная барацьба састарэлых, бясплённых і новых, перспектыўных сацыяльных формаў. У сувязі з гэтым рэвалюцыйныя пераўтварэнні заўжды выступаюць як адзінства стваральнага і разбуральнага пачаткаў. Пры гэтым для поспеху рэвалюцыі надзвычай важна забяспечыць дамінаванне канструктыўнага яе аспекта. Гістарычны досвед сведчыць, аднак, што ў мінулым паслядоўнае і поўнае вырашэнне дадзенай задачы ў большасці выпадкаў не было дасягнута, што амаль усе вялікія рэвалюцыі (у тым ліку і французская, як будзе паказана ніжэй) былі напоўнены жудаснай у сваёй трагічнасці парадаксальнасцю, якая зноў і зноў выводзіла на пярэдні план дух разбурэння і знішчэння.

Неабходна адзначыць, што барацьба скіраванага ў прышласць, плённага, прагрэсіўнага і старога, пазбаўленага творчых патэнцый і памкненняў, якая вызначае рэвалюцыйны працэс, адбываецца спачатку ў духоўнай сферы – як змаганне ідэй. Новы грамадскі лад паўстае найперш як культурна-гістарычная стратэгія, план і праграма. Гегель (цалкам правамерна!) падкрэслівае грунтоўнае значэнне філасофіі ў працэсе распрацоўкі апошніх, г. зн. у працэсе фарміравання духоўных перадумоў радыкальнага змянення асноў грамадскага жыцця [4, с. 74–75]. Крытычная філасофская думка выступае як першая адзнака і ў найвышэйшай ступені дзейсны фактар нарастання крызісных з’яў у грамадстве. Разам з тым складаныя, супярэчлівыя, крызісныя варункі даюць магутны штуршок інтэнсіўнаму разгортванню філасофскага пошуку, што ў сваю чаргу спрыяе паглыбленню і абвастрэнню крызіснай сітуацыі. Гэта азначае, што рэвалюцыйны працэс можа быць апісаны як складанае ўзаемадзеянне ідэальнага і рэальнага, як «парадаксальны» пераход аднаго ў другое, як здзяйсненне пэўнага комплексу ідэй (грунтам якога з’яўляецца крытычная філасофская рэфлексія) і яго ўзбагачэнне праз згаданую рэалізацыю.

Нечаканыя, радыкальныя і шмат у якіх адносінах трагічныя метамарфозы назіраюцца і ў разгортванні канкрэтных гістарычных працэсаў, што мелі месца падчас Вялікай французскай рэвалюцыі і непасрэдна пасля яе. Так, да найважнейшых перадумоў рэвалюцыйнага выбуху належаў усебаковы крызіс французскага абсалютызму, першыя сімптомы якога выявіліся ў перыяд яго росквіту [3, с. 34]. Магутная хваля рэвалюцыйна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

га ўздыму раструшчыла ў канчатковым выніку манархічны рэжым і ўсталявала рэспубліканскую форму арганізацыі дзяржаўнай улады. Рэспубліцы, аднак, быў наканаваны нядоўгі век. Да лета 1794 г. яна, як падавалася, дасягнула зеніту велічы і славы, зліквідаваўшы асноўныя асяродкі ўнутранай контррэвалюцыі і атрымаўшы вырашальныя перамогі ў ваенным супрацьстаянні з войскамі інтэрвентаў [2, с. 61]. Неўзабаве выявілася, аднак, што гэты трыумф меў нетрывалы падмурак: ён перайшоў у глыбокі крызіс, у выніку якога паўстала ваенная дыктатура Напалеона Банапарта, абвешчанага затым імператарам усіх французаў.

Найважнейшай прычынай такога разгортвання падзей было адзначанае пячаткай трагічнай супярэчлівасці кіраванне якабінцаў на апошнім этапе рэвалюцыі: у ім радыкальны дэмакратызм спалучаўся з дыктатарскімі і тэрарыстычнымі метадамі палітычнай барацьбы, а гуманістычныя праявы рэвалюцыйнай творчасці – з выбухамі жахлівай жорсткасці [3, с. 362–369, 387–392]. У выніку сапраўдны змест і канкрэтныя наступствы якабінскай дыктатуры ўсё больш разыходзіліся з ідэаламі і мэтамі яе лідараў [1, с. 58], і яна вычэрпвала сябе, набліжаючыся да свайго падзення.

Мудрагелістыя, парадаксальныя змяненні зведвала ў гэты час і культурна-гістарычная місія найважнейшых суб’ектаў міжнародных стасункаў. Так, рэвалюцыйная Францыя спачатку самаахвярна змагалася супраць змрочных сіл мінулага, сярод якіх істотнае месца належала еўрапейскім феадальным манархіям. На пэўным этапе разгортвання падзей, аднак, яна ператварылася ў бязлітаснага драпежніка, які імкнуўся да сусветнага панавання. У гэтых умовах манархічныя рэжымы, якія першапачаткова былі ўвасабленнем феадальнай рэакцыі і цемрашальства, апірышчам пазбаўленага ўсякай гістарычнай перспектывы старога грамадскага ладу, выступілі ў якасці барацьбітоў за свабоду. Пасля перамогі над Напалеонам, аднак, іх дзеянні зноў набылі змрочны, рэакцыйны сэнс.

Супярэчлівыя гістарычныя варункі цалкам заканамерна знаходзілі адпаведны адбітак у лёсах удзельнікаў драматычных рэвалюцыйных падзей. У жыцці большасці з іх гераічны рэвалюцыйны ўздым знік, растварыўся ў плыткіх, вузкапрагматычных інтарэсах. Для выдатнага кіраўніка якабінцаў Максіміліяна Рабесп’ера, які імкліва ўзнёсся на вяршыню палітычнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Алімпа, згаданы ўздым быў спынены гвалтоўнай смерцю. Што да галоўнага героя эпохі, Напалеона, дык і ў яго біяграфіі назіраецца рэзкі кантраст паміж ахопленым неўтаймоўнай прагай ведаў, зусім не варожым да прагрэсіўных ідэй юнаком і жорсткім заваёўнікам, у якога ён ператварыўся ў сталыя гады.

Складанасць, супярэчлівасць, неадназначнасць згаданай гістарычнай эпохі яскрава выяўлялася і ва ўмовах Германіі, у якіх была выпрацавана класічная версія дыялектычнай метадалогіі. Нямецкі народ пакутаваў ад феадальнай раздробленасці і іншых перашкод на шляху яго развіцця і тым не менш не мог з'яднацца і ўзняцца на барацьбу за вызваленне ад цяжару феадальных абмежаванняў. У такіх варунках ідэальная сфера філасофіі і мастацтва выявілася як асноўнае поле бітвы з усім, што аджыло ці аджывала свой век, не жадаючы, аднак, сысці з культурна-гістарычнай арэны і даць дарогу новаму, маладому жыццю.

Такім чынам, дыялектычная метадалогія Гегеля нясе на сабе выразны адбітак «парадаксальнага» характару той гістарычнай эпохі, ва ўмовах якой адбывалася яе распрацоўка. У сувязі з гэтым можна зрабіць выснову: класічнай дыялектыцы ўласцівая асаблівая ступень адпаведнасці крызісным, пераходным, рэвалюцыйным культурна-гістарычным сітуацыям, што робіць яе надзвычай дзейсным інструментам тэарэтычнага аналізу такіх сітуацый і пошуку адэкватных іх парадаксальнай сутнасці, скіраваных на інтэнсіўнае развіццё чалавека і грамадства практычных рашэнняў.


*1.* История Франции : в 3 т. / отв. ред. А. З. Манфред. – М. : Наука, 1973. – Т. 2. – 663 с.

*2. Манфред, А. З.* Очерки истории Франции XVIII–XX вв. : сб. ст. / А. З. Манфред. – М. : Изд-во Акад. наук СССР, 1961. – 616 с.

*3. Ревуненков, В. Г.* Очерки по истории Великой французской революции : 1789–1799 / В. Г. Ревуненков. – 2-е изд., доп. – Л. : Изд-во ЛГУ, 1989. – 536 с.

*4. Hegel, G. W. F.* Vorlesungen über die Geschichte der Philosophie: Erster Teil. / G. W. F. Hegel // Werke: in 20 Bd. / G. W. F. Hegel. – Bd. 18. – Frankfurt am Main: Suhrkamp, 1979. – 561 S.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ